Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

**Серыя «Адукацыя на Кобрыншчыне»**

# АД ЮННАТАЎ ДА ЭКОЛАГАЎ І КРАЯЗНАЎЦАЎ

***Да 55-годдзя з часу заснавання дзяржаўнай установы адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр экалогіі, турызму і краязнаўства»***

**Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне**

Кобрын
2022

УДК 016:37.018(476.7)
ББК 91.9:74.200.587(4Беи)
А28

Серыя заснавана ў 2020 годзе

***Складальнік:***
бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі
Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі *С. Д. Курачук*

А28 **Ад юннатаў да эколагаў і краязнаўцаў** : інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне да 55-годдзя з часу заснавання ўстановы адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр экалогіі, турызму і краязнаўства» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2022. – 60 с. : фат. – (Серыя «Адукацыя на Кобрыншчыне»).

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне «Ад юннатаў да эколагаў і краязнаўцаў» з серыі «Адукацыя на Кобрыншчыне» дае магчымасць азнаёміцца з вехамі гісторыі і вопытам работы дзяржаўнай установы адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр экалогіі, турызму і краязнаўства», дасягненнямі цэнтра па асноўных напрамках дзейнасці.

**УДК 016:37.018(476.7)**
**ББК 91.9:74.200.587(4Беи)**

© Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма, 2022

# АД СКЛАДАЛЬНІКА

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне «Ад юннатаў да эколагаў і краязнаўцаў» з серыі «Адукацыя на Кобрыншчыне» прысвечана 55-гадоваму юбілею дзяржаўнай установы адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр экалогіі, турызму і краязнаўства».

Юннатаўскі рух, які зарадзіўся ў Беларусі больш за 90 гадоў таму, развіваецца і ў нашы дні. На Кобрыншчыне ён вядзе свой адлік з 1967 года, калі ў адным з памяшканняў на вуліцы Савецкай адчыніла дзверы Станцыя юных натуралістаў, вядомая сёння як дзяржаўная ўстанова адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр экалогіі, турызму і краязнаўства».

За 55 гадоў існавання раённы цэнтр экалогіі, турызму і краязнаўства прайшоў шлях ад невялікай станцыі юных натуралістаў да сучаснай установы дадатковай адукацыі, якая адыгрывае важную ролю ў экалагічным выхаванні моладзі. Цэнтр выхаваў не адно пакаленне юных аматараў прыроды. Многія яго выхаванцы сталі навукоўцамі, біёлагамі, выкладчыкамі і даследчыкамі. Не адзін раз мянялася назва ўстановы, змяніўся не адзін кіраўнік, але нязменным заставалася адно - беражлівыя адносіны да прыроды, экалагічнае, патрыятычнае выхаванне моладзі.

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне «Ад юннатаў да эколагаў і краязнаўцаў» дае магчымасць пазнаёміцца з гісторыяй заснавання і сённяшнім днём цэнтра, дасягненнямі ўстановы па асноўных напрамках дзейнасці.

Выданне мае наступную структуру:

**Ад складальніка**

**I. Гісторыя станаўлення**

- *Кобрынская станцыя юных натуралістаў: пачатак юннатаўскага руху на Кобрыншчыне*
- *Дом юных натуралістаў: тут вучаць адчуваць прыроду*

**II. Сучаснае**

- *Раённы эколага-біялагічны цэнтр дзяцей і юнацтва - цэнтр экавыхавання*
- *Рукатворная прыгажосць*
- *Новыя праекты – новыя поспехі*
- *Ад пазашкольных заняткаў да будучай прафесіі*
- *Цэнтр экалогіі, турызму і краязнаўства – шматпрофільная пляцоўка для заняткаў дзяцей і падлеткаў*

**Спіс крыніц**

**Спіс перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік**.

Выданне прадстаўляе больш за 150 бібліяграфічных крыніц. Уключае артыкулы з перыядычных выданняў, пачынаючы з 1994 года. Кнігі размешчаны ў алфавіце аўтараў, назваў кніг, артыкулы – па гадах у зваротнай храналогіі, унутры года – у алфавіце аўтараў, загалоўкаў. Для раскрыцця зместу пры неабходнасці да запісаў даюцца кароткія даведачныя анатацыі.

Даведачны апарат прадстаўлены алфавітным спісам перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік.

Выданне змяшчае фотаздымкі розных гадоў з фотаархіва і сайта ўстановы адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр экалогіі, турызму і краязнаўства», а таксама з фотагалерэі Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі.

# I. ГІСТОРЫЯ СТАНАЎЛЕННЯ

## *Кобрынская станцыя юных натуралістаў: пачатак юннатаўскага руху на Кобрыншчыне*

*«**Кобрынская станцыя юных натуралістаў**. Засн. ў 1967. Аказвае дапамогу ў планаванні і арганізацыі доследніцкай і натуралістычнай работы ў школах горада, раёна, у вучнёўскіх вытв. брыгадах, лагерах працы і адпачынку, праводзіць работу па арыентацыі школьнікаў на с.-г. спецыяльнасці. Арганізуе масавыя мерапрыемствы натуралістаў (Свята працы і ўраджаю, Птушкі — нашы верныя сябры), выстаўкі кветак, конкурсы саматробных наглядных дапаможнікаў па біялогіі, вырабаў з прыродных матэрыялаў. Юннаты вырошчваюць расаду кветак для азелянення тэр. прадпрыемстваў і арг-цый горада.*

*У 1984 г. працуюць гурткі: пладаводства, кветкаводства, раслінаводства, акварыумнага рыбаводства, заалогіі, трусаводства, батанікі, феналогіі, аграхіміі, аховы прыроды. Працуе кіналекторый «Сябры прыроды», атрады «зялёнага» і «блакітнага» патрулёў.*

*Удзельнік ВДНГ СССР».*




**Энцыклапедыя прыроды Беларусі**: **у 5 т. - Мінск, 1984. - Т. 3. - С. 49.**

Юннатаўскі рух у былым СССР узнік у пачатку 20-х гадоў XX стагоддзя, а ўжо ў 1923 годзе ў многіх гарадах у школах дзейнічалі гурткі юных натуралістаў, у якіх дзеці знаёміліся з жывёльным светам, вучыліся вырошчваць сельскагаспадарчыя культуры. У 1930 годзе ў Мінску была створана першая ў рэспубліцы станцыя юных натуралістаў. Затым падобныя ўстановы пачалі паяўляцца ў буйных гарадах.

У 70-я гады мінулага стагоддзя юннатаўскі рух стаў інтэнсіўна развівацца і на Кобрыншчыне. Ва ўстановах адукацыі ствараліся школьныя лясніцтвы, блакітныя і зялёныя патрулі. З'явіліся традыцыйныя мерапрыемствы: дзень птушак, свята працы і ўраджаю, выставы зімовых букетаў.

У снежні 1967 года ў нашым горадзе на базе сярэдняй школы № 1 была створана Станцыя юных натуралістаў, якая з'яўлялася не толькі метадычным цэнтрам, але і цэнтрам працоўнай і прафесійнай арыентацыі вучняў школ горада і раёна.



Біяграфія ўстановы - яркае сведчанне таго, як чалавечыя рукі могуць ператварыць пустку ў квітнеючы сад. На месцы сучаснага цэнтра 55 гадоў таму была пустка. У той час станцыя юных натуралістаў займала невялікі неакультураны ўчастак зямлі, а навучальныя кабінеты знаходзіліся ў будынку з чырвонай цэглы каля сярэдняй школы № 1.

Першым дырэктарам станцыі юных натуралістаў стала *Яўгенія Пятроўна Новік*, якая кіравала ўстановай да 1970 года. Яна прыняла ў валоданне неабжытае памяшканне і з энтузіязмам узялася за работу. Расказваюць, як зімой у грузавой машыне з цёплай коўдрай у руках дырэктар Яўгенія Пятроўна ездзіла ў Брэсцкую абласную экалагічную станцыю. Набраўшы там хамячкоў, мышэй, рыбак і іншай жыўнасці і загарнуўшы іх у коўдру, прывезла першых гадаванцаў жывога кутка.



*Кіраўнікі Я. П. Новік і П. М. Валасюк*

Спачатку на станцыі юннатаў займалася ўсяго 180 дзяцей, якія наведвалі дзевяць гурткоў па кветкаводстве, агародніцтве і заалогіі. Першыя юннаты са сваімі педагогамі, з міру па нітцы сабраўшы насенне, заклалі агароднінны, кветкавы, палявы, калекцыйны ўчасткі.

З першых гадоў адкрыцця ўстановы гурткоўцы пад кіраўніцтвам захопленых сваёй працай педагогаў займаліся даследчай працай, у тыя гады - у асноўным сортавыпрабаваннем сельскагаспадарчых культур. І вельмі

паспяхова! Неаднаразова займалі першыя месцы на конкурсах розных рэгіянальных узроўняў.

У 1970 годзе эстафету кіраўніцтва станцыяй юннатаў прыняла маладая і энергічная *Яўгенія Іванаўна Цала*. А з 1971-га па 1989 год станцыю юных натуралістаў узначальваў *Пётр Мікалаевіч Валасюк*.



У 1978 годзе малады, апантаны цікавымі ідэямі дырэктар прапанаваў кіраўнікам гурткоў абнавіць стары фруктовы сад. Па дамоўленасці з прафесарам інстытута пладаводства ў Самахвалавіцкім гадавальніку было набыта 20 саджанцаў новых для Беларусі гатункаў яблыкаў.

Пётр Мікалаевіч садзейнічаў будаўніцтву новага, сучаснага для таго часу будынка і дзвюх цяпліц. У 1980 годзе юннаты атрымалі новы вучэбны корпус (вул. Савецкая, 104а), які складаўся з кабінетаў-лабараторый з неабходным абсталяваннем, нагляднымі дапаможнікамі і цяпліцы для кветак і агародніны. У той час дзейнічалі 39 гурткоў па васьмі профілях, якія наведвалі каля 650 школьнікаў. У даследчай дзейнасці актыўна выкарыстоўваўся вучэбна-доследны ўчастак плошчай 1,5 га. Станцыя дапамагала развіваць натуралістычную і доследную работу ў гарадскіх школах, вывучала і прапагандавала перадавы вопыт.

Дзеці праводзілі доследы па заданнях Беларускага навукова-даследчага інстытута пладаводства, агарод-

ніцтва і бульбы, Акадэміі навук БССР, рэспубліканскай і абласной станцый юннатаў. Пад кіраўніцтвам вопытных педагогаў праводзілася доследная работа па заданнях навукоўцаў Цэнтральнага батанічнага сада АН БССР і спецыялістаў сельскай гаспадаркі. Метадам спроб і памылак вывучалі ўплыў розных спосабаў размнажэння на рост, развіццё і ўраджайнасць буракоў, адсочвалі вынікі вырошчвання памідораў у адкрытым грунце.

Пра вялікі ўклад кіраўніка калектыву Пятра Мікалаевіча Валасюка ў працоўнае выхаванне школьнікаў сведчаць шматлікія граматы і дыпломы Міністэрства асветы БССР, гарадскога камітэта КПБ, гарсавета, гарадскога аддзела народнай адукацыі, званні «Выдатнік народнай адукацыі БССР» і «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР». Дэвіз жыцця П. М. Валасюка - «Вучыць любові да зямлі, павазе да працы».

***З успамінаў П. М. Валасюка:***

«*Учебный корпус и теплицы мы строили хозспособом. Такой метод не поощрялся вышестоящими инстанциями, но всю ответственность я взял тогда на себя. На первом этапе строительства я выполнял функции проектировщика, инженера, бухгалтера и… рабочего. Для осуществления работ привлекал военнослужащих, безработных, учеников и их родителей, сотрудников.*

*С благодарностью я всегда вспоминаю Г. Зыбайло, тогдашнего директора банка, который помог открыть счет на строительство станции, А. Леженя из горфинотдела, который впоследствии всю бухгалтерию взял на себя, П. Поплавского, председателя колхоза*

*«Советская Белоруссия» (д. Мазури), который помог финансами в деле создания системы отопления теплиц, Ф. Волосюка, председателя колхоза «Пески». На моем жизненном пути попадались понимающие люди, готовые поддержать нужное и важное дело. Одним словом, это была народная стройка. Строили добротно и с заботой о детях. Например, в нашем проекте теплицы были соединены с учебными классами, следовательно, ребятам не страшны были ни дождь, ни ветер, ни снег.*



*С юннатами работали опытные педагоги. Под их руководством проводилась опытническая и исследовательская работа по заданию ученых и специалистов сельского хозяйства. Например, только в 1979 году на учебно-опытном участке и в теплице проведен 21 опыт по заданию Белорусского научно-исследовательского института плодоводства, овощеводства и картофеля, Академии наук БССР, республиканской станции юннатов, областной станции юннатов, еще 11 опытов проведено в школах города».*

З цеплынёй успамінаюць кіраўнікоў гурткоў, якія працавалі ў той час.



Т. Заяц разам з хлопцамі-агароднікамі толькі на адным участку вырошчвала 12 сартоў таматаў. Л. Цімафеева, кіраўнік гуртка кветкаводаў, заклала са сваімі юннатамі шэсць доследаў па заданні Цэнтральнага батанічнага сада АН БССР, а пад кіраўніцтвам Т. Чарнушэвіч дзеці назіралі за развіццём маладняку трусоў (па заданні кандыдата сельскагаспадарчых навук В. Арлоўскага).

У 80-х гадах мінулага стагоддзя перспектыўным і цікавым быў удзел у выставах дасягненняў народнай гаспадаркі ў Маскве. Кобрынскія навучэнцы таксама прадстаўлялі свае працы на ВДНГ і часта станавіліся дыпламантамі і пераможцамі. Так, у 1980 годзе за добрыя вынікі ў вырошчванні трусаў юныя трусаводы былі адзначаны дыпломам I ступені Міністэрства асветы БССР. Па выніках ВДНГ БССР за 1982 год станцыя заняла 2-е месца. Поспехі кобрынскіх навучэнцаў у доследнай і прыродаахоўнай дзейнасці не засталіся незаўважанымі і на ВДНГ СССР, дзе станцыя атрымала дыплом II ступені.

У газеце «Камуністычная праца» 40-гадовай даўніны невялікая нататка красамоўна сведчыць аб выніках працы кобрынскіх юных натуралістаў і, адпаведна, аб рабоце дырэктара станцыі П. М. Валасюка: «*Дасягненні юных натуралістаў: вырашчаныя імі сельгаскультуры, вынікі*

*шматлікіх дасягненняў - дэманстраваліся на Выставе дасягненняў народнай гаспадаркі СССР. Станцыя, якая лічыцца адной з лепшых у рэспубліцы, узнагароджана дыпломам ВДНГ СССР ІІ ступені. Яе дырэктар - сярэбраным медалём ВДНГ. Медалямі выставы ўзнагароджаны і 14 юных натуралістаў*».

У 1989 годзе на змену Пятру Мікалаевічу прыйшоў *Валерый Яўгеньевіч Кірык*, які заставаўся дырэктарам па 1993 год. Пры ім быў арганізаваны першы дзіцячы кааператыў - навінка таго часу. Юннаты не толькі вучыліся вырошчваць гародніну і садавіну, разводзіць жывёл, але і рэалізоўвалі плён сваёй працы.

### *Дом юных натуралістаў: тут вучаць адчуваць прыроду*

З 1993 года ўстановай кіруе Лілія Аляксандраўна Страчук. У 1994 годзе станцыя юных натуралістаў была перайменавана ў Дом юных натуралістаў. Створаны тры аддзелы: экалогіі і аховы прыроды, кветкава-дэкаратыўны, заолага-жывёлагадоўчы. Юннаты пачалі асвойваць азы фермерскай гаспадаркі, вывучаць асновы сельскагаспадарчых прафесій у галіне пчалярства, трусагадоўлі, кветкаводства, агародніцтва і садаводства. Практычнай і доследнай работай навучэнцы займаліся ў парніковай гаспадарцы, трусятніку, жывым кутку і цяпліцах. Для захоўвання вырашчанай прадукцыі было пабудавана сховішча для агародніны.

У кабінетах і цяпліцах Дома юных натуралістаў шмат разнастайных кветак і дрэў, а ў кабінетах, дзе ў клетках папісквалі, чырыкалі, выдавалі іншыя гукі прадстаўнікі

птушынага і звярынага свету, дзеці вучыліся любіць і берагчы «братоў нашых меншых», усё жывое.

Папулярным быў гурток саломапляцення і інкрустацыі саломкай. Зробленыя яго выхаванцамі рэчы, якія экспануюцца ў выставачнай зале разам з іншымі вынікамі працы дзяцей і дарослых, не пакідаюць абыякавым нікога.



Акрамя работы ў гуртках, Дом юннатаў праводзіў набор у завочную малую лясную акадэмію, выпускнікамі якой сталі некаторыя гурткоўцы. Дзякуючы яе працы было створана навуковае таварыства навучэнцаў, якім кіраваў таленавіты педагог Сямён Васільевіч Левы. Ён аказваў падтрымку адораным навучэнцам, ствараючы спрыяльныя ўмовы для развіцця творчай асобы. Работа ў навуковым таварыстве была добрай практычнай школай для дзяцей у вывучэнні расліннага і жывёльнага свету прыроды Беларусі.

У 2005 годзе Дом юных натуралістаў атрымаў новую назву - Кобрынскі раённы эколага-біялагічны цэнтр дзяцей і юнацтва. Памянялася не толькі назва, быў зроблены вялізны скачок у развіцці ўстановы.

# II. СУЧАСНАЕ

***Раённы эколага-біялагічны цэнтр дзяцей і юнацтва — цэнтр экавыхавання***



На тэрыторыі Кобрынскага раёна гэта ўстанова адукацыі з'явілася буйнейшым цэнтрам экавыхавання. Менавіта тут любоў да прыроды выхоўваецца разам з усебаковым яе вывучэннем, а навуковая праца развіваецца на фоне жывых адносін з раслінным і жывёльным светам.

Асаблівая ўвага надаецца рабоце з адоранымі дзецьмі. У цэнтры створана навуковае таварыства навучэнцаў «Даследчык», якое з'яўляецца для іх штуршком у навуку. Тут дзеці авалодваюць навыкамі навуковага ўзаемадзеяння, набываюць вопыт удзелу ў навукова-практычных канферэнцыях, супрацоўнічаюць з прыродаахоў-

ымі арганізацыямі. Работы выхаванцаў таварыства займаюць прызавыя месцы на раённых, абласных і рэспубліканскіх навукова-практычных канферэнцыях. Вялікім дасягненнем таварыства «Даследчык» стала тое, што некаторыя яго выпускнікі зараз вучацца на біялагічных факультэтах, займаюцца ў аспірантуры, працуюць у інстытутах НАН Беларусі.

Школьнікі на працягу года ўдзельнічаюць у разнастайных раённых, абласных, рэспубліканскіх конкурсах, выставах, праводзяць прыродаахоўныя акцыі, распрацоўваюць і рэалізуюць экалагічныя праекты, прымаюць удзел у паходах, экскурсіях, экспедыцыях, наведваюць летнія профільныя лагеры. Штогод выхаванцы цэнтра займаюцца добраўпарадкаваннем тэрыторый. Асаблівы інтарэс у школьнікаў выклікае ўдзел у акцыі «Птушыныя сябры», якая праводзіцца з мэтай захавання біяразнастайнасці птушынага свету, у тым ліку засялення птушкамі садоў і паркаў. Шмат узнагарод атрымана і па выніках рэспубліканскай акцыі «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся».

Аб’яднанні па інтарэсах актыўна ўдзельнічаюць у выставе-конкурсе «Юннат года», дзе паказваюць дасягненні ў галіне паляводства, агародніцтва, пладаводства і кветкаводства, вырошчванні дэкаратыўных і лекавых, рэдкіх і малараспаўсюджаных культур, а таксама поспехі ў доследнай рабоце і мастацтве флорадызайну. Так, вынікам вялікай працы стаў дыплом І ступені ў конкурсе «Юннат-2010» у намінацыі «Даследуй і вывучай».

## ***Рукатворная прыгажосць***



Якіх толькі цудаў не сустрэнеш на тэрыторыі цэнтра! На базе ўстановы створаны эколага-біялагічны комплекс, дзе налічваецца каля 360 найменняў розных дрэў, кустоў, кветкава-дэкаратыўных, лекавых і востра-духмяных раслін.

У аптэкарскім агародзе расце больш за 30 відаў лекавых раслін. Даследчая работа ў гэтым агародзе дазваляе юннатам пазнаваць гаючыя ўласцівасці раслін, вывучаць агратэхніку іх вырошчвання і культывавання.

На тэрыторыі цэнтра можна ўбачыць разнастайныя віды афармлення клумбаў і ўчасткаў. Напрыклад, у стылі Версальскага палаца, юрскага перыяду.

Альпінарый, зроблены ў выглядзе альпійскай горкі, імітуе горны ландшафт. Паміж камянямі ў пясчаную глебу высаджаны засухаўстойлівыя і святлолюбівыя расліны, якія радуюць вока і ўпрыгожваюць тэрыторыю цэнтра з ранняй вясны да позняй восені.

Асаблівым гонарам установы з’яўляецца «Сад XXI стагоддзя». Разбіты ён па спецыяльнай схеме супер-інтэнсіўнага тыпу на клонавых падвоях. Гэтая тэхналогія павышае эфектыўнасць выкарыстання зямлі і прадук-цыйнасць працы, паляпшае якасць пладоў.



Рукамі кіраўнікоў аб’яднанняў па інтарэсах і навучэнцаў створаны пакаёвы сад, дзе сабрана 128 відаў кветкавых раслін – прадстаўнікоў розных прыродных зон.

Асобай папулярнасцю карыстаецца сад экзотаў. Яго калекцыя створана дзякуючы супрацоўніцтву педагогаў і дзяцей з жыхарамі горада. Шляхам абмену і асабістых кантактаў з насельніцтвам было набыта шмат рэдкіх, экзатычных раслін. Сад экзотаў налічвае больш за 20 разнавіднасцей экзатычных раслін, прывезеных з розных куткоў планеты. Сад прадстаўлены раслінамі, нехарак-тэрнымі для нашай мясцовасці: банан,ківі, цытрына, хурма, мушмула, бамбук, лаўр, інжыр, аліва, гранат,

маракуя, авакада, ананас, папая, фінік, кава, мурайя, гінкго.

У аранжарэі створаны куток кактусаў і сукулентаў. У ім можна ўбачыць расліны пустыняў і паўпустыняў, агаву, апунцыю, алоэ, каланхоэ і інш. І ўсе яны здзіўляюць сваёй прыгажосцю.



Увогуле, гэта цэлы батанічны сад, сапраўдны зялёны аазіс, дзе можна акунуцца ў трапічны свет, не выязджаючы з Беларусі.

Сюды за рэдкімі сартамі, асабліва дэкаратыўных кустоў, прыходзяць многія гаспадары ўласных дамоў. У цэнтры заўсёды гатовы даць добрую параду знаўцы садаводства і ландшафтнага дызайну; навучыць, як правільна аформіць клумбы, рабаткі (двайныя дарожкі), бардзюры і многаму іншаму, цікаваму і патрэбнаму.

У 2006 годзе ва ўстанове была створана экалагічная сцяжына. 12 станцый знаёмяць дзяцей з разнастайнасцю расліннага і жывёльнага свету, аб’ектамі прыроды і цікавымі мясцінамі цэнтра.

Адно з самых цікавых месцаў у цэнтры – куток жывой прыроды. Яго жыхарамі з’яўляюцца прадстаўнікі жывёльнага свету, якіх можна ўтрымліваць у дамашніх умовах. У кутку – 16 відаў жывёл, птушак і акварыумных рыб: марскія свінкі, дэкаратыўныя трусы, лабараторныя мышы, сірыйскія і джунгарскія хамякі, пацукі, пясчанкі, папугаі і іншыя. Зацікаўленымі вочкамі сустракае ўвесь гэты жывы куток наведвальнікаў. Асабліва любяць сюды прыходзіць малодшыя школьнікі, што і зразумела. У цэнтры дзеці не толькі атрымліваюць магчымасць паглядзець, але і вучацца, як трэба клапаціцца пра хатніх жывёл.





## ***Новыя праекты – новыя поспехі***

Вынікам працы кіраўнікоў і саміх гурткоўцаў стала прызнанне кобрынскага цэнтра на ўзроўні вобласці і рэспублікі адным з лепшых. Неаднаразова дасягненні навучэнцаў адзначаліся ўзнагародамі. На рахунку педагогаў і выхаванцаў установы шмат узнагарод, атрыманых у рэспубліканскіх конкурсах па азеляненні і добраўпарадкаванні тэрыторый устаноў адукацыі, энергаэфектыўнасці, кветкаводстве і садаводстве. За актыўную дзейнасць па прапагандзе экалагічнай культуры педагогі і выхаванцы цэнтра неаднаразова былі адзначаны высокімі ўзнагародамі абласнога і рэспубліканскага ўзроўню. Так, напрыклад, за 2018 год выхаванцы і іх кіраўнікі, таленавітыя педагогі, былі адзначаны 35 дыпломамі і ўзнагародамі розных узроўняў, два з якіх міжнароднага значэння.

На ІІ рэспубліканскім экалагічным форуме кобрынскі цэнтр заваяваў галоўны прыз - крыштальны зямны шар. Гэта вельмі дарагая ўзнагарода, пахваліцца якой можа далёка не кожная ўстанова.



Педагогі і навучэнцы актыўна ўдзельнічаюць у экалагічных форумах, акцыях і праектах. Буйнейшы сярод іх – міжнародны праект «Зялёныя школы». Трэба адзначыць, што калектыў ДУА «Кобрынскі раённы цэнтр экалогіі, турызму і краязнаўства» сам праявіў ініцыятыву ва ўдзеле, у выніку цэнтр атрымаў Дыплом II ступені.




У апошнія гады гэты праект аднавіўся, дзякуючы чаму была зноў атрымана перамога. У рамках конкурсу «Энергія сонца для Зялёных школ», у якім канкурсанты расказвалі пра свой вопыт рэалізацыі экалагічных і экасацыяльных праграм, акцый і праектаў, дзяліліся доўгатэрміновымі планамі ў гэтым кірунку, прыводзілі прыклады далучэння сваіх настаўнікаў і навучэнцаў да вырашэння актуальных экалагічных праблем, Кобрынскі раённы цэнтр экалогіі, турызму і краязнаўства набраў максімальную колькасць балаў.



У рамках праекта са снежня 2018 года на базе эколага-біялагічнага цэнтра створаны і паспяхова працуе клуб экалагічнага маніторынгу Брэсцкай вобласці, сярод задач якога - забеспячэнне даступнасці экалагічнай інфармацыі для насельніцтва, а таксама прыцягненне жыхароў да маніторынгу навакольнага асяроддзя і вырашэння экала-

гічных праблем у раёне. Цэнтр атрымаў каштоўнае абсталяванне - біноклі, мікраскопы; была створана свая лабараторыя, устаноўлена метэастанцыя і сонечная батарэя. З'явілася магчымасць праводзіць вельмі цікавыя і пазнавальныя заняткі і майстар-класы.

Кобрынскі цэнтр з'яўляецца найлепшым у рэспубліцы ў галіне ландшафтнага дызайну. Акрамя даследчай, навуковай, практычнай працы і ўдзелу ў конкурсах, установа прымае самы актыўны ўдзел у розных экалагічных акцыях: «Зялёнае свята», «Дапаможам крылатаму сябру», «Пасадзі дрэва Перамогі» і інш.

Нельга не адзначыць і багатае культурнае жыццё, якое вядуць выхаванцы цэнтра. Экалагічныя святы, конкурсна-забаўляльныя праграмы, разнастайныя гульні выхоўваюць не толькі клапатлівае стаўленне да навакольнага свету, але і пашыраюць кругагляд вучняў, развіваюць увагу і эстэтычныя якасці.

На працягу амаль 25 гадоў у цэнтры дзейнічае экалагічны тэатр «Радуга». За час яго існавання юныя акцёры-эколагі рэалізавалі шмат цікавых творчых ідэй. На святах і фестывалях любое выступленне гэтага незвычайнага тэатра заўсёды карыстаецца заслужанай увагай гледачоў - шыкоўна выглядаюць касцюмы з прыродных матэрыялаў на ўдзельніцах гуртка. Сёння экатэатр з’яўляецца сапраўдным упрыгожваннем любога мерапрыемства, сінтэзам сапраўднай творчасці, фантазіі і прыгажосці.



## *Ад пазашкольных заняткаў да будучай прафесіі*

Асновы будучай прафесіі і магчымасць прымераць яе яшчэ дзіцём дае сваім навучэнцам Кобрынскі раённы цэнтр экалогіі, турызму і краязнаўства. Педагогі цэнтра дапамагаюць дзецям знайсці сябе і сваё месца ў жыцці. Невыпадкова для шматлікіх выпускнікоў установа стала выдатнай стартавай пляцоўкай не толькі для атрымання прафесіі, але і для паспяховай кар'еры.

Цэнтр па праве ганарыцца сваімі выпускнікамі. Многія яго выхаванцы сталі вучонымі, біёлагамі, выкладчыкамі, даследчыкамі. Па статыстыцы ўстановы, прафесіі, звязаныя з біялогіяй, экалогіяй, медыцынай, выбіраюць прыкладна 35% выпускнікоў. Некаторыя выпускнікі вяртаюцца, але ўжо ў якасці педагогаў і кіраўнікоў аб'яднанняў па інтарэсах. Многія юныя кабрынчане прайшлі ў свае школьныя гады шлях юннатаў, змаглі не толькі самавызначыцца ў жыцці, але і выбралі будучую прафесію.

Адным з такіх людзей з'яўляецца дырэктар Кобрынскага раённага цэнтра экалогіі, турызму і краязнаўства **Лілія Аляксандраўна Страчук**, якая была навучэнкаў гэтай установы і вось ужо 30 гадоў паспяхова ёй кіруе.



Калісьці Лілія была адной з першых выпускніц тады яшчэ станцыі юных натуралістаў. У школьныя гады дзяўчынку прыцягвала атмасфера самой установы. Ды і працавалі там сапраўдныя «фанаты» сваёй справы -

біёлагі Яўгенія Іванаўна Цала, Людміла Мікалаеўна Цімафеева, Валянціна Паўлаўна Дарафеева.

Скончыўшы Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. С. Пушкіна, Лілія прыйшла сюды выкладчыкам, але прапрацаваўшы год, змяніла месца жыхарства. Праз сем гадоў ёй наканавана было вярнуцца і зноў узначаліць станцыю юннатаў.

Усё лепшае, што Лілія Аляксандраўна магла бачыць на форумах, канферэнцыях і экалагічных з'ездах, яна ўкараняла ў цэнтры. На яе вачах цэнтр прайшоў шлях ад невялікай станцыі юных натуралістаў да сучаснай установы дадатковай адукацыі, якая лічыцца адной з лепшых у рэспубліцы.

Лілія Аляксандраўна Страчук вядзе шырокую грамадскую дзейнасць. З'яўляецца старшынёй раённай арганізацыі «Беларускі саюз жанчын». У 2017 годзе Л. А. Страчук - сярод уладальнікаў ганаровага звання «Чалавек года Брэстчыны». Дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Кобрынскі эколага-біялагічны цэнтр дзяцей і юнацтва» атрымала свой пачэсны тытул за высокія дасягненні ў рабоце і вялікі асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё вобласці ў сферы аховы навакольнага асяроддзя.

Граматны біёлаг, справядлівы кіраўнік, адказны адміністратар, Лілія Аляксандраўна Страчук больш чым чвэрць стагоддзя займаецца выхаваннем экалагічнай культуры дзяцей у Кобрынскім цэнтры экалогіі, турызму і краязнаўства ў якасці выкладчыка, а апошнія 30 гадоў яшчэ і як кіраўнік.

**Левы Сямён Васільевіч** – прафесійны арнітолаг, выкладчык школы бёрдвотчара «Ад Бусла да Ястраба», спецыяліст па прыродаахоўных пытаннях грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны».



З Кобрынам у Сямёна Левага звязаны дзіцячыя і юнацкія гады. Тут ён нарадзіўся і рос, жыў і працаваў да 2006 года, пакуль не пераехаў у г. Барысаў.

Першыя крокі ў навуку вядомы беларускі арнітолаг Сямён Левы зрабіў у Кобрыне. Да прыроды роднага краю ён быў уважлівы заўсёды. Асабліва выявіўся гэты інтарэс у школьныя гады, калі пад чулым кіраўніцтвам настаўніка біялогіі Святланы Траццяк ён адкрываў для сябе таямніцы прыроды. Падказкі мудрага педагога, цікавасць да кніг па арніталогіі дапамаглі Сямёну акрэсліць кола інтарэсаў.

Пасля заканчэння СШ № 8 г. Кобрына Сямён працягнуў вучобу на біялагічным факультэце Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна, затым працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам у Аддзеле праблем Палесся Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

У 2003 годзе малады спецыяліст узначаліў навуковае таварыства вучняў у Кобрынскім эколага-біялагічным цэнтры і захапіўся даследчай працай. Ідэі педагога знайшлі падтрымку ў дырэктара цэнтра Ліліі Страчук, а неўзабаве да Сямёна прыйшло прызнанне. Пад яго кіраўніцтвам быў

створаны актуальны экалагічны маршрут па ўнікальных прыродных кутках малой радзімы, які стаў лепшым у вобласці ў 2005 годзе.

Сёння вучні Сямёна Левага Раман Шкабара, Вячаслаў Валасюк, Андрэй Якаўлеў, Аляксандр Страчук ужо самі сталі прафесіяналамі. А пракладзены імі ў наваколлях Дзівіна маршрут, які аб'яднаў на сваім шляху такія гістарычныя, краязнаўчыя, экалагічныя аб'екты, як Суво-раўскі дуб, царква Параскевы Пятніцы, возера Любань, біялагічны заказнік, дзе сустракаюцца расліны і птушкі, занесеныя ў «Чырвоную кнігу», да гэтага часу прыцягвае турыстаў.



Сямён Васільевіч Левы - бёрдвотчар з 25-гадовым стажам, які займае першы радок у спісе членаў аб'яднання «Клуб 200» (аб'яднанне людзей, захопленых наглядам за птушкамі), паколькі здолеў убачыць найбольшую колькасць відаў птушак на тэрыторыі Беларусі. Яго асабісты рэкорд - 281 від птушак, з якіх многія вельмі рэдка трапляюцца на вочы спецыялістам.

Ветэранам Кобрынскага раённага цэнтра экалогіі, турызму і краязнаўства вельмі прыемна, што іх выхаванец, які калісьці наведваў гурткі на станцыі юных натуралістаў, звязаў сваё жыццё з прыродай.

**Лукашук Аляксандр Алегавіч** — беларускі біёлаг, энтамолаг. Старшы навуковы супрацоўнік Бярэзінскага біясфернага запаведніка.



Нарадзіўся 25 мая 1964 года ў в. Шыповічы Кобрынскага раёна.

Прыгажосць і ўнікальнасць прыроды адкрылі юнаму даследніку біёлагі сярэдняй школы № 1 г. Кобрына, дзе Аляксандр вучыўся з 1971 па 1981 год, і педагогі станцыі юннатаў, гурткі якой хлопчык наведваў пасля ўрокаў. Сувязь з юннатаўскім рухам ён не страціў да гэтага часу, ужо многія гады Аляксандр Лукашук з'яўляецца членам журы злёту юных эколагаў Беларусі і Расіі.

Ва ўніверсітэце, куды юнак паступіў пасля года працы ў будаўнічай брыгадзе Кобрынскага інструментальнага завода, у яго завязалася супрацоўніцтва з доктарам біялагічных навук, прафесарам Ігарам Лапаціным, які і адкрыў дапытліваму студэнту свет насякомых ва ўсёй яго загадкавасцю і непаўторнасцю, а таксама пазнаёміў з адным з лепшых спецыялістаў І. Кержнерам з Заалагічнага інстытута Расійскай акадэміі навук у Санкт-Пецярбургу. Дзякуючы садзейнічанню і падтрымцы навуковых кіраўнікоў, Аляксандр змог пабываць у шматлікіх экспедыцыях на Далёкім Усходзе, ва Украіне, Арменіі, Абхазіі, Узбекістане, Таджыкістане, Казахстане, Карэліі, Балгарыі, Польшчы і Францыі.

У 1989 годзе Аляксандр закончыў біялагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна (спецыяльнасць – біёлаг).

У 1987 годзе паступіў на працу ў Бярэзінскі біясферны запаведнік. Спецыялізацыя — энтамалогія.

Кола навуковых інтарэсаў: сістэматыка, фаўністыка і экалогія паўжосткакрылых насякомых (Heteroptera); бесхрыбетныя жывёлы Бярэзінскага біясфернага запаведніка.

Асноўны характар працы: навуковыя даследаванні, праца з базамі дадзеных, экатурызм, біялагічная інфармацыя, маніторынг, ахова прыроды, экалагічная адукацыя.



Аляксандр Лукашук мае вопыт палявой і лабараторнай работы ў Беларусі, краінах блізкага і далёкага замежжа ў лясных, горных абласцях.

У творчай лабараторыі Аляксандра Лукашука ўжо сёння налічваецца больш за 120 апублікаваных навуковых і навукова-папулярных прац.

## ***Цэнтр экалогіі, турызму і краязнаўства – шматпрофільная пляцоўка для заняткаў дзяцей і падлеткаў***

Есть просто храм,
Есть храм науки,
А есть ещё природы храм.
С лесами, тянущими руки
Навстречу солнцу и ветрам.
Он свят в любое время суток,
Открыт для нас в жару и стынь,
Входи сюда, будь сердцем чуток,
Не оскверняй ее святынь!

*Александр Кардаков*

З 2019 года эколага-біялагічны цэнтр дзяцей і юнацтва перайменаваны ў ***Кобрынскі раённы цэнтр экалогіі, турызму і краязнаўства.***



Сёння ў цэнтры працуе чатыры аддзелы - экалагічны, кветкава-дэкаратыўны, аддзел краязнаўства і патрыятычнага выхавання, а таксама аддзел турызму і спартыўнага арыентавання. І ў кожнага аддзела ёсць свае поспехі і дасягненні, свае вучні і выпускнікі, многім з якіх заняткі ў цэнтры экалогіі, турызму і краязнаўства далі

пуцёўку ў будучую прафесію.

У цэнтры па-ранейшаму ўдзяляецца вялікая ўвага доследнай і навукова-даследчай рабоце. Гэта адзін з эфектыўных шляхоў прафарыентацыі школьнікаў і далучэння іх да працы. Падчас доследнай дзейнасці навучэнцы замацоўваюць, развіваюць і паглыбляюць біялагічныя і сельскагаспадарчыя веды, практычныя ўменні і навыкі. Работа аб'яднанняў па інтарэсах «Юныя садаводы», «Юныя арнітолагі», «Кветкаводства», «Эколаг і я» адзначана дыпломамі абласнога ўпраўлення адукацыі.



Дзецям тут цікава, і яны лічаць, што дарослыя стварылі для іх сапраўдны дзіцячы рай. Сёння ў 82 аб'яднаннях па інтарэсах займаецца больш за 1000 навучэнцаў, якія цікавяцца прыродай, адкрываюць для сябе яе таямніцы, ставяць эксперыменты і праводзяць даследаванні на актуальныя тэмы. Гэта не проста гурткі, гэта сучасныя лабараторыі, праца ў якіх пастаўлена на навуковую аснову.

Калектыў цэнтра адрозніваецца сваёй крэатыўнасцю. У асноўным ён малады, творчы. Гэта прафесіяналы сваёй справы і энтузіясты. Разам яны робяць важную і патрэбную справу, усё магчымае, каб навучэнцы на занятках дзіцячых аб'яднанняў пашыралі свой кругагляд, развіваліся ў атмасферы любові і павагі да сваёй малой радзімы, прыроды, вядомых людзей роднага краю, яго звычаяў і традыцый, гістарычнай памяці і культуры. Вопытныя педагогі вучаць дзяцей навыкам, прамудрасцям сельскагаспадарчага жыцця, добрым адносінам да ўсяго жывога, дапамагаюць дзецям убачыць прыгожае вакол, разумець прыгажосць роднай прыроды, шанаваць і прымнажаць яе, дораць ім унікальную магчымасць адчуць сябе часткай прыроды.



Работа супрацоўнікаў Кобрынскага раённага цэнтра экалогіі, турызму і краязнаўства не ацэньваецца выдатнымі ці сярэднімі ведамі выхаванцаў, як у іх калег у школе. Тут

другое вымярэнне: любоў да зямлі, на якой жывем, да ўсяго, што закаляе нас, без чаго чалавек не можа адбыцца. І ўсяму гэтаму тут цярпліва і з любоўю вучаць юных кабрынчан, якія хочуць лепей пазнаць свет.

У 2020 годзе ў цэнтры экалогіі, турызму і краязнаўства творчым калектывам пад кіраўніцтвам Валянціны Аляксееўны Ігнацюк была створана «Летопись центра: события, даты, люди», якая, дарэчы, на абласным конкурсе ўзнагароджана дыпломам І ступені, а на рэспубліканскім – дыпломам ІІ ступені Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

...Час ідзе. Многае мяняецца. У адміністрацыі і педагогаў дзяржаўнай установы адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр экалогіі, турызму і краязнаўства» шмат планаў на будучае.




Мы
ОБЕЩАЕТ
БЕРЕЧЬ ПРИРОДУ
ЗАГАДИЛ
ДОМ СВОЙ
НЕ ЗАГРЯЗНЯЙ
ЧУЖОЙ!
ТКО
СТЕКЛО





ГОСУДАРСТВЕННОЕ УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
КОБРИНСКИЙ РАЙОННЫЙ
ЦЕНТР ЭКОЛОГИИ, ТУРИЗМА И КРАЕВЕДЕНИЯ

# КОБРЫНСКІ РАЁННЫ ЦЭНТР ЭКАЛОГІІ, ТУРЫЗМУ І КРАЯЗНАЎСТВА –

**г э т а**

## САДРУЖНАСЦЬ

**дзяцей і дарослых,**

## РАДАСЦЬ

**сумеснага творчага працэсу,**

## ПРАЦА

**вялікага калектыву прафесіяналаў.**





# СПІС КРЫНІЦ

**Кобрынская станцыя юных натуралістаў** // Энцыклапедыя прыроды Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1984. – Т. 3. – С. 49.

